**Шульгат, Т.** Дарога дамоў / Т. Шульгат // Родныя вытокі (Докшыцы). — 2008. — 13 лют. — С. 1.

## ДАРОГА ДАМОЎ

Ён часта праглядвае кінафільмы пра Афган, глядзіць і ўспамінае сябе маладога, сяброў, якіх там жа знаходзіў і страчваў...

– У кіно не так, як у жыцці. На самай справе нават колер таго часу не падобны ні на які вядомы нам, і нідзе яго больш не сустрэнеш, толькі там – у далёкім Афганістане.

Анатоль Ільіч Парцянка не вельмі любіць на людзях успамінаць час, які правёў там. Хаця часта яго запрашаюць выступіць у мясцовую Тумілавіцкую школу, дзе ён расказвае больш аб тым, як неабходна шанаваць адзін аднаго, памятаць і любіць сваю Радзіму. А яму гэта пачуццё добра знаёмае. Правесці тры гады на чужыне, дзе ўсё не люба, за тысячы кіламетраў ад роднай вёсачкі, дзе замест звыклага вясковага гоману на панадворку гучаць пастаянныя выстралы, крыкі, дзе, каб выжыць і зноў ахінуць сваімі ўжо ўзмужнелымі рукамі матулю, неабходна заўсёды быць гатовым далюбога загаду...

Дарога дадому. З тым хваляваннем не параўнаеш ні адно пачуццё на свеце. І зараз, калі Анатолю Ільічу прыйшлося ўспомніць той момант, яго вочы падазрона заблішчалі. Шкада, што не кожны салдат, якому прыйшлося панюхаць «афганскага» попелу, адчуў гэта.

У пятніцу ён зноў сустрэнецца са сваімі сябрамі, якіх аб’ядноўвае агульная «афганская» памяць. І будуць успамінаць яны не тыя дні, якія акроплены крывёю іх саслужыўцаў, а мірнае жыццё. Анатоль Ільіч раскажа пра сваю дачушку-прыгажуню, якой ужо споўнілася 18 год, пра сыноў, пра работу, пра жыццё, дзе няма выстралаў, ворагаў, смерці...

**Т. Шульгат**